**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за сакавік 2020 г.**

**<u>Мерапрыемствы да Міжнароднага жаночага дня</u>**

**4 сакавіка**

У рамках праекта «Хобби–центр 55+» у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшоў вечар адпачынку «Плесните колдовства в хрустальный мрак бокала…». Госці мерапрыемства праслухалі натхненныя і вершы рускіх паэтаў і рамантычныя музычныя нумары. Завяршыўся вечар святочным чаяпіццем.

ЦРБ, 55 чал.

**4 сакавіка**

Інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Жанчыны Беларусі - крок у гісторыю» адбылася ў рамках праекта «Бібліятэка без межаў». Падапечныя Кобрынскага ТСЦАН здзейснілі займальнае падарожжа ў гісторыю ўзнікнення свята 8 Сакавіка, пазнаёміліся з імёнамі яркіх жанчын свету: Ефрасінняй Полацкай, Эміліяй Плятэр, Элізай Ажэшка, Элаізай Пашкевіч, якія дзякуючы поспехам у літаратуры, жывапісу, тэатры ўпісалі свае імёны ў беларускую гісторыю.

ЦРБ, 18 чал.

**6 скавіка**

Да свята на абанеменце цэнтральнай бібліятэкі праходзіла акцыя для жанчын «Читайте лучше – только лучшее!». Усе жанчыны, якія наведалі бібліятэку ў гэты дзень, маглі ўзяць у карыстанне кнігі з камерцыйнага фонду на 10 дзён бясплатна.

**6 сакавіка**

Літаратурна-музычны вернісаж «Ад усёй душы!» быў прысвечаны жаночай палове Кобрынскай РООО «БелТІЗ». Прагучалі словы віншавання старшыні арганізацыі Смяховіч Валянціны Мікалаеўны, якая ўручыла ўдзельніцам мерапрыемствы памятныя падарункі.

Вядучыя на працягу ўсяго мерапрыемства дарылі цёплыя паэтычныя радкі і віншаванні. Выдатныя музычныя нумары ад вакальнай групы цэнтральнай бібліятэкі «Фантазія» сталі добрым падарункам для ўсіх гледачоў, якія сабраліся ў зале.

ЦРБ, 58 чал.

**11 сакавіка**

Літаратурна-гульнявое свята «Весна. Девчонки. Позитив» прайшоў у бібліятэцы. Для ўдзелу ў праграме дзеці падзяліліся на дзве каманды: «Незабудки» (дзяўчынкі) і «Тюльпаны» (хлопчыкі). Размінкай для іх сталі пытанні літаратурнай віктарыны «Рыцари и принцессы». Потым каманды спаборнічалі ў конкурсах «Кулинарные догонялки», «Мода 21 века», «Что в

косметичке?», «Хозяин и хозяюшка», адгадвалі загадкі пра прысмакі. Пад канец свята хлопчыкі павіншавалі дзяўчынак са святам вясны і, прачытаўшы ім вершы і ўручыўшы кветкі, запрасілі за святочны стол. Афармлена кніжная выстава «Ты на свете лучше всех!».

Гарадзецкі філіял, 21 чал.

## Мерапрыемства да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам.

**4 сакавіка**

Вечар-пратэст «У черты, за которой мрак» прайшоў для навучэнцаў старэйшых класаў СШ № 3. З дапамогай відэапрэзентацыі «Долгая смерть короткой жизни» вядучыя нагадалі падлеткам пра небяспеку наркотыкаў, вырабаталі стратэгію бяспечных паводзінаў, правялі віктарыну «Опасность, которая рядом». Урач-валеолаг Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева расказала пра сутнасць наркаманіі і яе віды, аб формах прафілактыкі і магчымасцях яе лячэння. Завяршылася сустрэча праглядам відэароліка «Точка невозврата».

ЦРБ, 56 чал.

**5 сакавіка**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу для навучэнцаў сярэдніх класаў правяла тэматычную праграму «Наркомания – путь в никуда». Дзеці пазнаёміліся з відамі наркотыкаў, прычынамі, якія вядуць да залежнасці, небяспекай і шкодай наркотыкаў. Праведзена анкетаванне, рэклама літаратуры па здароваму ладу жыцця, прагледзены сацыяльныя відэаролікі.

Залесская ПБ, 35 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**11 сакавіка**

Адбыўся кансультацыйна-прававы форум «У лабірынце правоў і абавязкаў», прысвечаны Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Сусветнага дня правоў спажыўцоў. Навучэнцам Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа прапанаваны: відэапрэзентацыя «Закон законаў. Канстытуцыя ў нашым жыцці», інтэлектуальна-прававая віктарына «Канстытуцыя ў пытаннях і адказах», выстава дзяржаўнага свята «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь: для людзей і ў імя будучыні», інтэрактыўная прэзентацыя «Своечасовыя веды для сучаснага спажыўца», адкрыты прагляд літаратуры «Граматны спажывец» і многае іншае.

Кансультацыі правялі спецыялісты праваабарончых арганізацый г. Кобрына: загадчык натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Ірына Пятроўна Марчук, адвакат юрыдычнай кансультацыі Кобрынскага раёна Наталля Аляксееўна Алексяюк.

*(Белов, Д. На шаг ближе к правовой культуре / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2020. – 18 сакавіка. – С. 4).*

ЦРБ, 77 чал.

**12-13 сакавіка**

Галоўны бібліёграф Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Святлана Курачук прыняла ўдзел у І Рэспубліканскім краязнаўчым форуме Рэспублікі Беларусь, які прайшоў у рамках Года малой радзімы. Галоўны бібліёграф удзельнічала ў секцыі "Асоба ў краязнаўстве: з гісторыі біяграфій беларускіх краязнаўцаў", выступіла з дакладам "Асоба ў гісторыі малой радзімы. А. М. Мартынаў". Леанід Міхайлавіч Лыч, беларускі гісторык, публіцыст, доктар гістарычных навук, прафесар, які прысутнічаў на форуме, падараваў кобрынскай бібліятэцы сваё выданне з памятным надпісам.

*(Дубіна, Л. Свята краязнаўцаў / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. – 2020. – 25 сакавіка. – С. 8).*

.

**15 сакавіка**

Чарговае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» пацешыла мясцовых паэтаў сюрпрызамі. Урачыстасць надала прэзентацыя зборніка вершаў Марыны Міхалюк «Под парусом души». Паэты падзяляліся творамі, напісанымі ў якасці хатняга задання, паўдзельнічалі ў літаратурнай гульні «Поэтическая капель». Завяршылася пасяджэнне індывідуальнымі кансультацыямі па вершаскладанню.

ЦРБ, 20 чал.

**20 сакавіка**

Аб'яўлены літаратурны конкурс духоўнай паэзіі «Есть сила благодатная в созвучьи слов живых», прымеркаваны да 500-годдзя Жыровіцкага манастыра.

**24 сакавіка**

Удзельнікі свята праваслаўнай кнігі «Истинное чудо – православие Белой Руси» здзейснілі відэаэкскурсію ў гісторыю Кобрынскага манастыра ў імя Ўсяміласцівага Спасу, пазнаёміліся с падзеямі ў летапісы Свята-Ўспенскага Жыровіцкага манастыра, адказалі на пытанні інтэлектуальнай віктарыны «Просветители земли белорусской». З вялікай цікавасцю дзеці разглядалі старажытныя царкоўныя кнігі і вучыліся чытаць на царкоўнаславянскай мове ў айца Георгія, ігумена царквы Ўшэсця Госпадняга аг. Гарадзец. У завяршэнні свята кожны змог узяць ўпадабаную літаратуру з выставы праваслаўных мастацкіх выданняў «Православная детская книга».

Гарадзецкі філіял, 41 чал.

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**3 сакавіка**

У межах Года малой радзімы да 80-годдзя з часу заснавання ААТ «САЛЕА-Кобрын» бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі выдадзены бібліяграфічны паказальнік ««САЛЕА-Кобрын»: стаўка на экспарт і мадэрнізацыю» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына».

**17 сакавіка**

Бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі падрыхтаваны сцэнарны матэрыял да прававога, пазнавальна-гульнявога форума «У лабірынце праў і абавязкаў», прысвечаны Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Сусветнаму дню праў спажыўцоў. Утрымвае вялікую колькасць інтэрактыўных віктарын, прававых гульняў, сітуацыйных заданняў, тэставых заданняў, практыкаарэнтаванных сітуацый.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3-85-81